*Рупліўцы*

# АРХЕАЭТЫМАЛАГІЧНЫ МЕТАД І ВЫВУЧЭННЕ ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ ЦЫРКУМБАЛТЫЙСКАГА РЭГІЁНА

У артыкуле разглядаюцца звесткі пра выкарыстанне археолагам, этнографам і культуролагам Марыяй Гімбутас сінтэтычнага метаду даследавання старажытнай і традыцыйнай культуры еўрапейцаў, сфарміраванага на сумежжы лінгвістыкі, этнаграфіі, рэлігіязнаўства і параўнальнай міфалогіі.

Ключавыя словы: *археаэтымалагічны метад, Цыркумбалтыйскі рэгіён, Старая Еўропа, Марыя Гімбутас.*

The article examines information about archaeologist, ethnographist and culturologist Maria Gimbutas' synthetic method of studying ancient and traditional culture of the Europeans, with was formed at the intersection of linguistics, ethnography, religion and comparative mythology.

Цыркумбалтыйскі рэгіён утвараюць землі народаў, якія засяляюць узбярэжжа Балтыйскага мора. Паводле найбольш лагічнага для даследавання традыцыйных культур *фізіка-геаграфічнага* абгрунтавання рэгіянальнасці (заснаванага на вызначэнні дрэнажнага басейна рэк, якія ўпадаюць у Балтыйскае мора), да Балтыйскага ці *Цыркумбалтыйскага рэгіёна* далучаюць: краіны Прыбалтыкі, Польшчу, асноўную частку Швецыі і Фінляндыі, частку Даніі і Беларусі, паўночна-ўсходнюю Германію і паўночна-заходнюю Расію, невялікія тэрыторыі Украіны, Чэхіі і Славакіі [5]. Населены фіна-уграмі, балтамі, скандынавамі і славянамі рэгіён мае даволі стракатую карціну традыцыйных культур, параўнальнае вывучэнне якіх вымагае методыкі, што "не капітулюе" перад дакладна-гістарычным аналізам генезісу традыцыі, здольная рабіць кроскультурныя параўнанні, дапаўненні і рэканструкцыі страчаных фрагментаў, улічвае вынікі комплексных палявых даследаванняў этнографаў і фалькларыстаў. Досвед XX ст. паказаў, што найбольш істотных поспехаў у гэтым кірунку дасягаюць даследчыкі, чый асноўны метад – археаэтымалагічны.

Строга кажучы, *археаэтымалагічны метад* быў вынайдзены і апрабаваны напрыканцы XX ст. сусветнавядомым археолагам, этнографам і культуролагам **Марыяй Гімбутас** (літоўск. Marija Gimbutienė, анг. Marija Gimbutas, 1921 – 1994) пры рэканструкцыі духоўнага падмурку стараеўрапейскай цывілізацыі. Гімбутас здолела даказаць, што ўсе бакі жыцця і культуры еўрапейцаў неаліту вызначаліся іх духоўнасцю, рэлігійнымі вераваннямі і светапоглядам. Паколькі ў неалітычных культурах знаходзяцца вытокі земляробчай і сямейнай абраднасці традыцыйных асяродкаў Еўропы, даведацца пра асноўныя складнікі духоўнасці нашых продкаў падавалася неабходным многім даследчыкам. Аднак у іх канцэпцыях часта бракавала важкіх элементаў: універсальнасці, сцвярджэнняў-артэфактаў ці паслядоўнасці і логікі ў тлумачэнні вядомых навуцы звестак. Абапіраючыся на аналіз неалітычных малюнкаў і сімвалаў, М. Гімбутас прыцягнула мноства матэрыялаў з сумежных навук – дадзеныя лінгвістыкі, этнаграфіі, рэлігіязнаўства, параўнальнай міфалогіі – і атрымала маналітную панараму стараеўрапейскай культуры, ад якой на момант даследавання засталіся купка слаба ідэнтыфікаваных артэфактаў, рэшткі цьмяных легенд і абрадаў. Назва метаду таксама належыць аўтару [1, с. 9]. Каб апрабаваць яго ў дзеянні і верыфікаваць тыпалогію каранёвых еўрапейскіх культур, М. Гімбутас (на той момант – прызнаны спецыяліст па індаеўрапеістыцы) прааналізавала тысячы выяў жанчын, знойдзеных археолагамі ў многіх кутках зямлі. Фінал навуковай спадчыны гэтага напрамку, удала складзены ў трылогію ("Багі і багіні старажытнай Еўропы", "Мова багінь", "Цывілізацыя багінь"), па меркаванні спецыялістаў, выдатна абгрунтаваны і "спалучае навуковую строгасць з захапляльнасцю выкладання матэрыялу" [1, с. 9].

Знаўцы дасканалых лінгвістычных методык (да распрацоўкі дзейсных аналагаў якіх у этналогіі і фалькларыстыцы заклікалі антраполаг К. Леві-Строс і філосаф М. Эліядэ) ведаюць, што пры дэшыфроўцы пісьмовых помнікаў бываюць выпадкі, калі строгі аналіз тэкстаў бездапаможны. Калі невядомыя дакладна ні пісьмовасць, ні мова помнікаў, на дапамогу спецыялісту прыходзяць інтуіцыя і эрудыцыя. У такіх сітуацыях перавагу мае *этымалагічны* метад, асабліва ў тым выпадку, калі вядомыя, хоць нават і ўмоўна, некаторыя значэнні знакаў. Этымалогіяй завецца навука аб высвятленні страчаных матывіровак і, такім чынам, аб даследаванні паходжання адпаведных слоў. Лінгвісты, якія добра валодаюць параўнальна-гістарычнай характарыстыкай асобных моў або моўных сем'яў, могуць высветліць этымалагічнае сваяцтва таго ці іншага слова [6].

Археаэтымалагічны метад, якім мусіла карыстацца М. Гімбутас, заснаваны на аналізе паходжання і гістарычнага развіцця пэўнага складніка культуры цягам пэўнага часу. Развіццё культуры – гэта бесперапынныя змены, што адбываюцца ва ўсіх звёнах яе структуры (матэрыяльным, светапоглядным, паводзінным), таму асобнае даследаванне помніка, без уліку культурнага кантэксту яго існавання, малавыніковае.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ









**Выданні М. Гімбутас, прысвечаныя розным аспектам гісторыі і архаічнай культуры еўрапейцаў.**

Вопытны археолаг (бліскуча ведала артэфакты сусветнага палеа- і неалітычнага мастацтва, пахавальныя абрады, сімволіку арнаментаў палеаеўрапейцаў, балтаў, фіна-уграў, славян, германскіх і раманскіх народаў), М. Гімбутас дапоўніла артэфакты звесткамі з міфалагічных і рэлігійных сістэм Усходу, Захаду і Поўначы, падмацавала вынікі этнаграфічнымі ведамі звычаяў, каляндарных, абрадавых сістэм і містычных практык міжземнаморскіх, паўночных і цыркумбалтыйскіх народаў. У выніку матэрыяльны, светапоглядны і паводзінны бакі архаічных культур Еўропы былі скаардынаваны і сістэматызаваны з дапамогай суаднясення з этапамі старажытнай гісторыі Еўразіі. Вынайдзены археаэтымалагічны метад атрымаўся гіпертрафавана міждысцыплінарным, асацыятыўным і энцыклапедычным. Таму навуковы і культурны "бэкграўнд" даследчыка, які ім карыстаецца, павінен быць вельмі насычаным.

У згаданым аспекце прываблiваюць якасцi асобы заснавальніка археаэтымалагічнага метаду. У дзяцінстве Марыю Гімбутас, тады яшчэ Марыю Бірутэ Алсейкайтэ, з шасці гадоў навучалі ў школе па методыцы Марыі Мантэсоры, што заснавана на індывідуальным падыходзе педагога да кожнага дзіцяці. Яно само выбірае дыдактычны матэрыял і працягласць заняткаў, развіваецца ва ўласным рытме і напрамку. Да паступлення ў гімназію М. Гімбутас вывучыла нямецкую і польскую мовы, засвоіла ігру на фартэпіяна. Летам 1937 г. яна ўпершыню выехала ў этнаграфічную экспедыцыю на паўночны захад Літвы. У Віленскім універсітэце (пасля навучання ў Каўнаскім) у 1940-я працягвала вучобу ўжо як фалькларыст. У вольны час запісвала фальклор ад бежанцаў з Беларусі [1, с. 6]. Дысертацыю (па тыпах пахавання ў славян) М. Гімбутас абараніла ў нямецкім Цюбінгене, пасля чаго працавала ў ЗША як лектар, перакладчык, даследчык-палявік, музейны супрацоўнік. Фарміраванне методыкі будучага даследавання, такім чынам, увабрала *археалагічны, этнаграфічны, лінгвістычны, мастацтвазнаўчы аспекты* (што немагчыма без энцыклапедычнай і рознабаковай мастацкай адукаванасці даследчыка), узмоцненыя прынцыпова самастойным і інавацыйным (з уласным рытмам і напрамкам) падыходам да прадмета даследавання.

Прыкладанне аўтарскай методыкі М. Гімбутас адразу дало істотныя вынікі, якія ліквідавалі шмат белых пляму этнагенезе, фальклоры і культурнай тыпалогіі еўрапейцаў. У 1956 г. яна надрукавала працу "Перадгісторыя Усходняй Еўропы. Частка І. Культуры мезаліту, неаліту і бронзавага веку ў Расіі і Балтыі", дзе прапанавала выкарыстоўваць класіфікацыю тыпаў курганоў для вызначэння межаў рассялення славян. Пасля публікацыі вынікаў даследавання да М. Гімбутас прыйшло заслужанае прызнанне навуковай грамадскасці. Яе працу параўноўваюць па значэнні з дасягненнямі Ф. Шампаліёна, які здолеў расшыфраваць егіпецкія іерогліфы. "Перадгісторыя Усходняй Еўропы" на дакладнай, добра сістэматызаванай аснове падала поўную карціну маршрутаў славянскіх міграцый у Еўропе. Распрацаваная методыка дазволіла "прамаляваць" вектары і заканамернасці міграцыйных і этнакультурных рухаў на архаічных землях сучасных краін Прыбалтыкі, Польшчы, Швецыі, Фінляндыі, Даніі, Беларусі, Германіі, Расіі, Украіны, Чэхіі і Славакіі; акрэсліць уплывы на іх старажытнае насельніцтва з боку культур продкаў працаскіфаў і кімерыйцаў. Практычна ў той жа час выйшла праца "Старажытныя сімвалы ў літоўскім народным мастацтве" М. Гімбутас, дзе прааналізаваны характар каранёвага субстрату мастацтва народаў Балтыі. Над цыркумбалтыйскімі культурамі даследчыца працавала і пазней, у 1971 г. яна публікуе кнігу "The Slaves" ("Славяне"). Неўзабаве гэтае аб'ектыўнае і ідэалагічна незалежнае даследаванне выйшла на асноўных еўрапейскіх мовах [1, с. 9]. Якасць аналізу матэрыяльных і культурных помнікаў Цыркумбалтыйскага рэгіёна сродкамі аўтарскай методыкі была бясспрэчна прызнана навуковай супольнасцю.

Адкрытасць і крэатыўнасць М. Гімбутас заклалі патэнцыял яе сусветнавядомай трылогіі, дзе яна дэманструе цэласнае ўяўленне пра развіццё Еўропы да пачатку індаеўрапейскага ўплыву. На аснове ўласных археалагічных і культуралагічных

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

штудый даследчыца прыйшла да высновы, што становішча жанчыны ў першабытнай культуры было цэнтральным, а само існаванне гэтай культуры адбывалася ў гарманічнай і этнаэкалагічнай згодзе з прыродай. У кнізе "Цывілізацыя багінь" яна ўпершыню паказала сістэмныя шматузроўневыя адрозненні паміж еўрапейскімі культурамі неаліту і бронзавага веку. Рэзананс ад гэтых прац выйшаў далёка за межы навуковай грамадскасці.

Многія высновы М. Гімбутас падаліся сучаснікам занадта смелымі, але яны адпавядалі запатрабаванням часу і мелі этыялогію, знітаваную з яе светапоглядам, адукацыяй, выхаваннем, вынікамі навуковых даследаванняў і асабістым лёсам. Марыі неаднаразова давялося адчуць бязлітаснасць і жорсткасць таталітарызму. Улетку 1940 г., у адпаведнасці з пактам Молатава-Рыбентропа, у Літву ўвайшла Чырвоная армія і неўзабаве ўзнікла Літоўская ССР. Віленскі ўніверсітэт зачынілі, пачаліся арышты і дэпартацыя насельніцтва. Амаль усе родныя М. Гімбутас бясследна зніклі. Жывучы на Захадзе, яна ў 1960-я гг. мусіла ўтойваць, што ў яе ёсць сваякі ў СССР, а пасля наведвання савецкіх універсітэтаў і вяртання ў ЗША ёй давялося апраўдвацца перад уладамі. Пабываўшы ў СССР, М. Гімбутас стала паслядоўным прыхільнікам пашырэння навуковых сувязяў паміж Усходам і Захадам, а ў 1960 г. яна атрымала прэмію Міжнароднага камітэта па справах бежанцаў за намаганні ў наладжванні міжкультурнага дыялогу. Але маштабная і аб'ектыўная ацэнка ўсёй спадчыны Марыі Гімбутас, відаць, яшчэ наперадзе.

Нягледзячы на бясспрэчнае прызнанне вынікаў даследаванняў цыркумбалтыйскага матэрыялу ў стартавых працах навукоўцы, яе пазнейшыя, еўразійскі і глабальна арыентаваныя працы – трылогія "Багіні і багі Старой Еўропы" (1974), "Мова Багіні" (1989) і "Цывілізацыя Багіні" (1991) – выклікалі даволі стрыманыя ацэнкі ў акадэмічным асяроддзі. М. Гімбутас, верная сабе, смела і паслядоўна намалявала ідэалізаваную карціну матрыярхальнага даіндаеўрапейскага грамадства Старой Еўропы, пабудаванага на роўнасці і цярпімасці (паводле М. Гімбутас, "апошні ўзлёт" гэтага грамадства – Мінойская цывілізацыя на даэлінскім Крыце эпохі бронзы). Па перакананні даследчыцы, у выніку набегу на стараеўрапейскія абшары намадаў-індаеўрапейцаў на змену "залатому веку" прыйшла андракратыя – улада мужоў, пабудаваная на вайне і крыві. Гэтыя меркаванні выклікалі станоўчы водгук сярод рухаў феміністычнай і неаязычніцкай арыентацыі, але не атрымалі падтрымкі ў навуковым асяроддзі, якое традыцыйна скіравана на пошукі генезісу цывілізаванасці і культуры на Усходзе, а не на Захадзе.

Ніхто, аднак, не мог адмовіць М. Гімбутас у паслядоўнасці, маштабнасці і выніковасці яе навукова-даследчай метадалогіі. У 1968 г. яе абралі членам Амерыканскай акадэміі навук, а газета "Лос-Анджалес таймс" назвала "жанчынай года". Напрыканцы 1960-х амаль штогод выходзілі навуковыя працы і кнігі даследчыцы, іх перакладалі на розныя мовы свету. У 1970-я М. Гімбутас была кіраўніком усіх раскопак неалітычных паселішчаў у Югаславіі, Македоніі, Грэцыі і Італіі, фінансаваных па навуковых праграмах ЗША. Кожнае лета яна выязджала ў экспедыцыі і адначасова выступала з лекцыямі ў розных універсітэтах. Вынікі яе працы адзначаны шматлікімі міжнароднымі навуковымі прэміямі.

Сувязь з "матчынай" для яе літоўскай традыцыяй – часткай цыркумбалтыйскага комплексу традыцыйных культур – М. Гімбутас не перарывала ніколі, нават у часы сваіх еўразійскіх і глабалістычных штудый, знаходак і навуковых трыумфаў [3]. Вывучэнне іншых культур тут не замінала, а дапамагала. З дапамогай археаэтымалагічнага метаду яна ўпэўнена ўвяла літоўскую культуру ў сусветны навуковы кантэкст і ўвесь час нястомна прапагандавала яе вывучэнне (імя яе трэцяй дачкі – Раса, архаічная назва літоўскага Купалля). Паслядоўнасць і прынцыповасць даследчыцы паважалі і прыхільнікі, і апаненты: у 1981 г., у разгар "халоднай вайны", нягледзячы на няпростыя адносіны паміж ЗША і СССР, на працягу двух месяцаў прафесар М. Гімбутас працавала ў Віленскім універсітэце, дзе яе лекцыі наведала больш за тры тысячы студэнтаў. Вынікі ўкаранення распрацаванай Марыяй Гімбутас археаэтымалагічнай методыкі, якая "наводзіць масты" паміж археалогіяй, этнаграфіяй і антрапалогіяй, гарантуюць ёй адно з выбітных месцаў сярод найбуйнейшых спецыялістаў па вытоках культур і цывілізацый [2, с. 6].

### Спіс літаратуры


1. **Гимбутас, М.** Славяне : пер. с англ. Ф. Капицы / М. Гимбутас. – М. : ЗАО Центрполиграф, 2003. – 216 с.
2. **Даниленко, В. Н.** Космогония первобытного общества / В. Н. Даниленко // Начала цивилизации. – Екатеринбург : Деловая книга; М. : Раритет, 1999. – С. 3 – 216.
3. **Gimbutienė, M.** Baltų mitologia : senovės lietuvių deivės ir dievai / M. Gimbutienė. – Vilnius : Lietuvos rašitojų s-gos liedukla, 2002. – 164 p.
4. **Мария Гимбутас** : биография [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.people.su/28184. – Дата доступа : 12.03.2014.
5. **Страны Балтии** [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http: //www.amberbridge.org/article?id=68. – Дата доступа : 12.03.2014.
6. **Яралиев, Я. А.** Этимологический метод / Я. А. Яралиев, Н. О. Османов [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http: //alpan365.ru/biblioteka/istoriya-lezgin-yaraliev-osmanov-tom-i-pelazgi/metod-deshifrovki-kritskix-pisem-istoriya-lezgin/. – Дата доступа : 12.03.2014.



**Вячаслаў КАЛАЦЭЙ,**
загадчык кафедры этналогіі і фальклору
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
культуры і мастацтваў,
кандыдат культуралогіі.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ